# ФЕСТЫВАЛЬ У РАЎБІЧАХ

## Біятлонныя зоркі прыедуць у Беларусь у лютым

**«Гонка легендаў» гэтай зімой трэці раз вяртаецца ў Раўбічы разам са старымі знаёмымі і новымі ўдзельнікамі. Арганізатары абяцаюць, што 18 лютага гэтага года фестываль атрымае яшчэ большы размах.**

У спартыўным комплексе пад Мінскам аматары спорту змогуць убачыць Дар'ю Домрачаву, Надзею Скардзіна, Алену Зубрылаву, Сімону Хаўсвальд, Корын Ніерге, Ганну Багалій, Флорэнс Баверэль, Алену Пятрову і Кацярыну Дафоўскую. Таксама да нас прыедуць шматразовыя алімпійскія чэмпіёны Уле-Эйнар Б'ёрндален, Рыка Грос, Хальвард Ханевольд, Андрэй Дзярызямля, Венсан Дэфран, Фрода Андэрсан, Сяргей Чэпікаў, П'ер Альберта Карара. І добра знаёмыя беларусам Аляксандр Папоў, Сяргей Новікаў і Аляксей Айдараў.

У праграме фестывалю — мас-старт і змешаная эстафета, але, мабыць, самай галоўнай і кранальнай падзеяй стануць провады з вялікага спорту чатырохразовай алімпійскай чэмпіёнкі Дар'і Домрачавай і алімпійскай чэмпіёнкі Пхёнчхана-2018 Надзеі Скардзіна.

Усе балельшчыкі таксама змогуць трапіць на аўтограф-сесію легендаў біятлона, якая адбудзецца паміж гонкамі.

Як паведамлялася раней, праз два дні пасля «Гонкі легендаў» Раўбічы прымуць чэмпіянат Еўропы. Нядаўна стала вядома, што заяўкі на ўдзел у турніры падалі 34 нацыянальныя федэрацыі біятлона. У спаборніцтвах у Раўбічах прымуць удзел 164 біятланісты і 153 біятланісткі. Для параўнання: у 2004 годзе ў чэмпіянаце Еўропы ў Раўбічах узялі ўдзел 12 краін. За ўсе дні спаборніцтваў спарткомплекс наведалі 75 тысяч гледачоў. Нагадаем, білеты на біятлонныя мерапрыемствы ў лютым ужо паступілі ў продаж.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ЛЁД СТАНЕ ГАРАЧЫМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Усяго на турніры ў Мінску выступяць больш за 100 атлетаў, Беларусь прадставяць танцавальная пара Ганна Кублікова і Юрый Гуліцкі, а ў мужчынскім адзіночным катанні — Якаў Зянько. Найбольш высокія шанцы на прызавыя месцы ў чатырох відах праграмы — у расійскай зборнай, за яе выступяць двухразовыя чэмпіёны Еўропы спартыўная пара Яўгенія Тарасава і Уладзімір Марозаў, алімпійская чэмпіёнка Пхёнчхана Аліна Загітава і дзве ўзыходзячыя зоркі расійскай каманды Станіслава Канстанцінава і Соф'я Самадурава. У мужчынскім адзіночным катанні за медалі будуць змагацца Максім Коўтун і бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 2018 года Міхаіл Каляда.


**Алімпійская чэмпіёнка Пхёнчхана расіянка Аліна ЗАГІТАВА.**
Фота БелТА.

Пераможцы чэмпіянату Еўропы па фігурным катанні ў Мінску ў адзіночным разрадзе ў мужчын і жанчын атрымаюць узнагароду ў 21 тысячу долараў. Сума прызавых за другое месца складзе 16 тысяч, за бронзу — 11 тысяч. У спартыўным парным катанні і танцах на лёдзе прызавыя медалістам складуць 30 тысяч долараў, 20 тысяч і 12 тысяч.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**




ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Рэйтынг — стабільны

**Рэйтынгавае агенцтва Fitch пацвердзіла доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя суверэнныя крэдытныя рэйтынгі Беларусі па абавязацельствах у замежнай і нацыянальнай валюце на ўзроўні «В», прагноз «стабільны». Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве фінансаў.**

Агенцтва адзначыла бездакорную аплатную дысцыпліну суверэна, а таксама ўмацаванне макраэканамічнай стабільнасці ў краіне, значны ўклад у якую ўнёс збалансаваны характар макраэканамічнай палітыкі. Агенцтва таксама пацвердзіла рэйтынг еўрааблігацый Беларусі на ўзроўні «В».

**(Ул. інф.)**

## Грашовых заробкаў з-за мяжы стала менш

**Нашы работнікі сталі менш дасылаць грошай на радзіму. Грашовыя пераводы беларусам з-за мяжы летась скараціліся на 12,75 % у параўнанні з 2017 годам, паведамляе Нацыянальны банк.**

У цэлым за мінулы год гастарбайтары пералічылі на радзіму 326 мільёнаў долараў супраць 373,67 млн долараў годам раней. За мінулы год з Беларусі было адпраўлена грашовых пераводаў на 175 млн долараў. Гэта на 6,3 % больш, чым у 2017 годзе, калі было адпраўлена 164,5 млн долараў. Сярэдняя сума аднаго пераводу ў нашу краіну склала 287,67 долара, з яе — 364,2 долара. Пры падліку ўлічваліся грашовыя пераводы, здзейсненыя праз міжнародныя сістэмы Western Union, «Юністрым», «Залатая карона», Money Gram, BLIZKO, «Лідар», Contact, «Калібры», Faster, Ria Money Transfer.

## Пошта на вёсцы пасябравала з дэпазітам

**З пачатку года дадзены старт першаму этапу сумеснага праекта Беларусбанка і Белпошты па абслугоўванні жыхароў у сельскай мясцовасці.**

На пачатковым этапе ў аддзяленнях паштовай сувязі будуць ажыццяўляцца аперацыі па тэрміновых банкаўскіх укладах у беларускіх рублях. Гэта стала магчыма пасля выкарыстання спецыялістамі пошты цэнтралізаванай аўтаматызаванай банкаўскай сістэмы.

Рэалізацыя праекта дазволіць кліентам афармляць усю лінейку банкаўскіх укладаў Беларусбанка ў беларускіх рублях, адкрываць бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак з выкарыстаннем банкаўскай плацежнай карткі і папаўняць яе, афармляць пакет дакументаў і заключаць крэдытныя дагаворы ў падраздзяленнях РУП «Белпошта». Усе этапы праекта завершацца да 1 мая.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Незвычайны госць на Свіслачы

**Рэдкі від качкі — нырэц-маранка — заўважаны ў цэнтры сталіцы.**

Такая інфармацыя з'явілася на сайце грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Гэта ўжо другая рэгістрацыя віду ў Мінску. Першы раз яго назіралі тры гады таму, у пачатку студзеня 2016 года.



Нырца-маранку ўжо тыдзень як можна пабачыць сярод качак-крыжанак на незамерзлых участках Свіслачы паміж дамбай Камсамольскага возера і Палацам спорту. Птушка не баіцца людзей, актыўна нырае на дно па малюскаў, умее пастаяць за сябе перад качкамі-крыжанкамі, нягледзячы на свой малы памер. Падобна на тое, што яна вырашыла тут затрымацца.

Арнітолагі тлумачаць, што гэты від гняздуецца ў тундры. Большую частку свайго жыцця птушка праводзіць у моры. Яна нават больш нырае, чым плавае, бо здабывае сабе водных жучкоў, малюскаў, іншых беспазваночных недзе на дне, пад вадой. Гэтая качка рэдкая не толькі для Беларусі. Нырэц-маранка занесены ў Міжнародны чырвоны спіс як уразлівы від — колькасць птушак імкліва скарачаецца.

Нагадаем, што ў студзені грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Навукова-практычны цэнтр па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзяць штогадовы зімовы ўлік вадаплаўных птушак **для таго, каб ацаніць, колькі птушак і якіх відаў зімуюць у Беларусі, і сплanаваць дзеянні па іх захаванні.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Небяспечны веласіпед

**У вёсцы пад Гроднам аўтамабіль пераехаў веласіпедыста, які ляжаў на дарозе.**

Аварыя адбылася 20 студзеня ў вёсцы Табала Гродзенскага раёна. Аўтамабіль «Рэно», за рулём якога знаходзіўся 30-гадовы жыхар Гродзенскага раёна, здзейсніў наезд на 44-гадовага мужчыну, які ляжаў на дарозе. Ад атрыманых траўмаў той памёр на месцы.

Па словах **намесніка начальніка Гродзенскага РАУС Валерыя ШАМРУКА,** пацярпелы ехаў на веласіпедзе. Як і калі ён упаў з яго, пакуль невядома. Ніхто з мясцовых жыхароў гэтага не бачыў. Наезд на веласіпедыста адбыўся каля 19 гадзін вечара. Ці быў ён у нецвярозым стане, таксама пакуль невядома. Ёсць інфармацыя, што пацярпелы неаднаразова прыцягваўся да адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху як пешаход.

Валерый Шамрук зазначыў, што апошнім часам павялічылася колькасць аварый з удзелам веласіпедыстаў. Толькі ў Гродзенскім раёне рэгіструецца ад трох да васьмі парушэнняў. А між тым для гэтага транспарту таксама ёсць шэраг абмежаванняў. Нельга карыстацца веласіпедам ва ўмовах снегападу і галалёдзіцы. А гэтымі днямі якраз і назіралася такое надвор'е. Таксама існуюць пэўныя патрабаванні да стану самога сродку. Калі раней на веласіпедах былі простыя святлоадбівальныя катафоты, то зараз павінны быць ліхтары, якія свецяць пастаянна, спераду — белым святлом, а ззаду — чырвоным.



Што датычыцца данай аварыі, веласіпедыст меў на адзенні святлоадбівальныя элементы, але невядома, ці мог кіроўца своечасова іх заўважыць, калі той ляжаў на дарозе. Заведзена крымінальная справа.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## Свята скончылася панажоўшчынай

**Вяселле ў Віцебску скончылася рэанімацыяй для айчыма нявесты, яго нажом параніў навасцечаны сваяк.**

Па інфармацыі УУС Віцебскага аблвыканкама, інцыдэнт адбыўся ўначы. Айчым і маці нявесты прыехалі на вяселле з Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння ўрачыстасці сваякі маладых паехалі на здымную кватэру, дзе працягнулі гулянні. У нейкі момант бацька жаніха ўстаў і ўдарыў нажом у шыю айчыма нявесты. Мужчыну даставілі ў рэанімацыю, ён жывы. Параніўшы сваяка, навасцечаны свёкар растлумачыць прычыны ўдару не змог.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПЕРШЫ ЗІМОВЫ

**Фатаграфаванне і вызначэнне птушак на час, або адным словам — фотабёрдынг, набірае ў Беларусі папулярнасць. Пад эгідай ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) ужо праведзена восем чэмпіянатаў, якія праходзілі як у сталіцы, так і ў двух абласных цэнтрах — Брэсце і Гомелі. Цяпер жа, 26 студзеня, стартуе першы зімовы чэмпіянат па фотабёрдынгу, які носіць пакуль эксперыментальны характар па фармаце правядзення.**

Па-першае, месца правядзення — любое, гэта значыць кожны выбірае яго сам. Ведаеш, дзе больш за ўсё птушак зімой, едзь туды і фатаграфуй на здароўе. Па-другое, ужо можна карыстацца любым відам транспарту. Гэта, дарэчы, і з пункту гледжання ўмоў надвор'я вельмі правільна. Замерз — сеў у аўтобус ці маршрутку, праехаў да наступнага «птушынага» пункта, заадно і сагрэўся.

Птушак зімой у Беларусі, вядома, паменш будзе, чым у астатнія поры года (і істотна, прыкладна ў два разы), затое менавіта ў зімовы час на тэрыторыі нашай краіны з'яўляюцца віды птушак, якіх не ўбачыш гарачым летам. Акрамя знаёмых многім гілёў і амялушак, «паргэцца» да нас прылятаюць звычайная і попельная чачоткі, сняжуркі (пуначкі), рагатыя жаваранкі і інш. Рагатых жаўрукоў я якраз і сустрэў гэтым студзенем у вёсцы Даўгалессе Гомельскага раёна. Там жа і планую прымаць удзел у чэмпіянаце па зімовым фотабёрдынгу. Дарэчы, удзел бясплатны, і любы ахвотны можа падаць заяўку да **17.00 25 студзеня.** Спяшайцеся! Больш падрабязна пра акцыю па спасылцы **http://ptushki.org/news/656030.html.**

Птушкі чакаюць удалых здымкаў!

**Максім ШАСТАКОЎ, член савета Гомельскага рэгіянальнага аддзялення АПБ.**

